# УШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ ГЕРОЯЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў НАЗВАХ ВУЛІЦ СМАРГОНІ

**А. Ю. Нікалаева**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,
г. Гродна, Беларусь

Навуковы кіраўнік – загадчык кафедры замежных моў,
канд. філал. навук, дацэнт С. Г. Ляскевіч

Вайна пакінула балючы і невыпраўны след у гісторыі нашай краіны. На жаль, мы не зможам вярнуць да жыцця тых, хто загінуў для светлай будучыні сваіх нашчадкаў, але гэтыя героі будуць жыць вечна ў нашых думках, сэрцах, а памяць пра іх ушаноўвалася, ушаноўваецца і будзе ўшаноўвацца ў карцінах таленавітых мастакоў, у закранаючых пачуцці кожнага чытача творах літаратуры, у помніках скульптуры і архітэктуры, у назвах школ, прадпрыемстваў, вуліц.

Жыхары маёй малой радзімы, горада Смаргоні, прымалі непасрэдны ўдзел у вызваленні не толькі нашага горада, але і іншых вёсак і гарадоў Беларусі і нават за яе межамі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Таксама дапамагалі вызваляць Смаргонь і сыны іншых краёў і народаў. У знак падзякі і павагі да Азі Асланава, Аляксандра Камінскага, Мікалая Гастэлы, Пятра Машэрава былі названы вуліцы гарадскога пасёлка [1, с. 39, с. 137, с. 255].

Калі імёны Мікалая Гастэлы і Пятра Машэрава добра знаёмыя беларусам: і маім равеснікам, і людзям старэйшага ўзросту, то пра геройскія ўчынкі Азі Асланава і Аляксандра Камінскага ведаюць значна менш. Таму *мэтай* дадзенага артыкула мы бачылі вывучэнне гісторыі подзвігу А. Асланава і А. Камінскага, выяўленне іх унёску ў вызваленне Смаргоні і Смаргонскага раёна, сувязей з нашай мясцовасцю. Дасягненне пастаўленай мэты немагчымае без падрабязнага знаёмства з біяграфіямі герояў.

А. Камінскі нарадзіўся на Смаргоншчыне, А. Асланаў вызваляў гэтую зямлю.

Азі Агадовіч Асланаў нарадзіўся 22 студзеня 1910 г. ў горадзе Ленкарань Бакінскай губерніі (цяпер Ленкаранскі раён Азербайджана). У падлеткавым узросце страціў бацьку, таму хлопец з самага дзяцінства працаваў вельмі старанна, меў вельмі стойкі і моцны



Репозиторий ГрГМУ

характар, які і дапамог яму з годнасцю прайсці ўсе астатнія выпрабаванні жыцця. У 1924 г. юнак становіцца вучнем Закаўказскай ваенна-падрыхтоўчай школы № 1 у г. Баку. Затым яго накіроўваюць ў Барысаглебска-Ленінградскую кавалерыйскую школу, пасля заканчэння якой у 1931 г. яго прызначаюць камандзірам узвода 15-га кавалерыйскага палка 3-й Бесарабскай кавалерыйскай дывізіі імя Катоўскага. Юнак не спыняецца на дасягнутым, ён заканчвае курсы пры Ваеннай акадэміі бранятанкавых войскаў, становіцца камандзірам узвода асобнай танкавай роты.

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны А. Асланаў ужо атрымлівае званне маёра і камандуе аўтатранспартным батальёнам 10-й танкавай дывізіі. Гераізму і самаадданасці Азі Асланава ў бітвах не было межаў. На рахунку танкістаў яго 55-га танкавага палка шмат подзвігаў. Адным з іх стала супрацьстаянне перадавым часткам групы войскаў “Дон” Э. Манштэйна ў снежні 1942 г. Разам з даручанымі яму салдатамі Азі Агадовіч не дазволіў нямецкім войскам прарвацца да акружанай 6-й арміі Ф. Паўлюса. У выніку жорсткай бітвы ў раёне Верхня-Кумска танкістам Асланава ўдалося знішчыць 30 танкаў, 26 гармат, 50 аўтамашын і каля 2 тысяч варожага асабовага складу. Ужо 22 снежня 1942 г. падпалкоўнік Асланаў быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза, а ўзначалены ім 55-ы асобны танкавы полк стаў гвардзейскім.

У студзені 1943 г. Азі Асланаў атрымаў званне палкоўніка і быў прызначаны камандзірам 35-й гвардзейскай танкавай брыгады 3-га гвардзейскага механізаванага корпуса, сфарміраванай на аснове 41-га гвардзейскага танкавага палка. 13 студзеня 1943 г. газета Сталінградскага фронту «Сын Айчыны» адзначала: «… таму, як звязваць танкавыя аперацыі з дзеяннямі пяхоты і артылерыі, трэба вучыцца ў часткі гвардыі палкоўніка А. Асланава. Няхай баявое ўменне танкістаў Героя Савецкага Саюза А. Асланава будзе ўзорам для ўсіх нашых падраздзяленняў...» [2, с. 149].

4 ліпеня 1944 г. 35-я гвардзейская танкавая брыгада Асланава пад моцным артылерыйскім і мінамётным агнём ворага фарсіравала раку Вілію і ў 9 гадзін 30 хвілін штурмавала Смаргонь. Тут Азі Асланаў праявіў сябе як выдатны тактык і стратэг, які прымаў неардынарныя рашэнні ў экстрэмальных сітуацыях. Каб падмануць праціўніка адносна напрамку галоўнага ўдару брыгады, ён накіраваў у абход горада злева танкавы ўзвод і роту аўтаматчыкаў, а сам павёў наступленне трыма танкамі ў цэнтры. Смелым манеўрам танкі Асланава



Репозиторий ГрГМУ

прарваліся ў горад. Услед за танкістамі ў горад уварваліся гвардзейцы-аўтаматчыкі і партызаны. У 15 гадзін 4 ліпеня горад Смаргонь быў поўнасцю вызвалены, а 8 ліпеня 1944 г. была вызвалена ўся тэрыторыя Смаргонскага раёна.

На жаль, усяго некалькі месяцаў не дажыў Азі Асланаў да сваёй перамогі, да перамогі Чырвонай арміі: 24 студзеня 1945 г. ў адным з баёў быў смяротна паранены, і 25 студзеня 1945 г. памёр у шпіталі № 4396. Адбылося гэта недалёка ад латвійскага горада Прыекуле. Пахавалі Героя Савецкага Саюза ў Баку. На момант гібелі яму толькі споўнілася 35 год.

21 чэрвеня 1991 г. за паспяховае кіраўніцтва баявымі дзеяннямі 35-й гвардзейскай танкавай брыгады і асабісты гераізм падчас аперацыі "Баграціён" Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр танкавых войскаў Азі Ахад аглы Асланаў другі раз быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза (пасмяротна). Ордэн Леніна і другі медаль "Залатая Зорка" атрымалі сваякі генерала. Сярод яго ўзнагарод: ордэн Айчыннай вайны I ступені, ордэн Чырвонай Зоркі (2), ордэн Чырвонага Сцяга (2), ордэн Аляксандра Неўскага, ордэн Суворава II ступені, медаль "За абарону Каўказа".

Імем вялікага героя Азі Асланава названы станцыя метро і Дом афіцэраў у Баку, школа № 175 у Баку, школа № 3 у Ленкарані і школа ў Валгаградзе, вуліцы ў Баку, Ленкарані, Імішлі, Валгаградзе і Смаргоні. Каля ДУА "Сярэдняя школа № 2 г. Смаргоні" высаджана каштанавая алея ў яго гонар.

Адна з вуліц Смаргоні названа ў гонар майго земляка, Аляксандра Камінскага, які вёў барацьбу супраць фашыстаў у Мінску. Аляксандр Аляксандравіч Камінскі нарадзіўся ў вёсцы Камяніца Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1939 г. ён быў адпраўлены на вучобу, пасля атрымання адукацыі Камінскі стаў оперупаўнаважаным у Ашмянскім раённым аддзеле міліцыі.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны Аляксандр Камінскі, як і многія іншыя супрацоўнікі міліцыі, аказаўся ў акружэнні. Яму ўдалося выйсці да сваёй хаты, аднак заставацца там – азначала падвяргаць сям'ю небяспецы. Гэта і стала прычынай таго, што Камінскі перабраўся ў Мінск, каб стаць удзельнікам падпольнай антыфашысцкай арганізацыі.

Каб увайсці ў давер да немцаў, Камінскі пачаў працаваць у мінскай паліцыі. Атрымаўшы пасаду загадчыка зброевага склада, ён пачаў рэгулярна адпраўляць боепрыпасы партызанам. Акрамя



Репозиторий ГрГМУ

таго, Камінскі збіраў сакрэтныя нямецкія каштоўныя дакументы. Аднак немцам удалося раскрыць і арыштаваць Камінскага. Сам начальнік паліцыі пажадаў суправадзіць яго ў турму, але па дарозе Аляксандр Камінскі змог вызваліцца і задушыць яго, а затым – схавацца.

Пасля ўцёкаў Камінскі далучыўся да групы «Мсціўцы», якая дзейнічала ў Мінскай вобласці. Гэты партызанскі атрад вёў актыўную разведку на захопленых нацыстамі тэрыторыях і праводзіў буйныя баявыя аперацыі. Камінскі ўдзельнічаў у шматлікіх заданнях «Мсціўцаў», самым значным з якіх стала забойства ў снежні 1943 г. саюзніка акупацыйнай улады мінскага бургамістра прафесара В. Л. Іваноўскага.

Аляксандр Камінскі загінуў падчас выканання баявога задання каля вёскі Сёмкаў Гарадок Мінскага раёна 3 ліпеня 1944 г., не дажыўшы да вызвалення Мінска зусім няшмат. За ўзорнае выкананне спецыяльных заданняў у тыле праціўніка, праяўленыя мужнасць і адвагу ён быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені. У яго гонар названа вуліца ў Смаргоні, а таксама школа ў аграгарадку Крэва Смаргонскага раёна.

Героі майго артыкула – людзі розных нацыянальнасцей, якія, кожны на сваім месцы, самаахвярна рабілі адзіную справу па вызваленні сваёй шматнацыянальнай дзяржавы ад фашысцкай навалы. Гэта людзі, якія коштам свайго жыцця дасталі для нас перамогу ў вогненнай і вельмі жорсткай барацьбе. Памяць пра герояў не павінна загінуць, такія людзі заўсёды павінны жыць у нашых думках, сэрцах, вершах і паэмах, у памяці народнай.

**Літаратурныя крыніцы:**

1. Іх імёнамі названы… . Энцыклапедычны даведнік / Рэдкал.: Шамякін І. П. (гал. рэдактар) і інш. – Мінск.: Беларуская Савецкая энцыклапедыя, 1987. – 711 с.

2. Багиров, М. Путь генерала: Историко-биографический очерк о генерале А. Асланове / М. Багіров. – Баку: Язычи, 1988. – 181 с.

Репозиторий ГрГМУ